№ 1. Серада, 14 верасьня (1 сенцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska, 9).

Падпіска з паштовай перасылкай на 2 месяцы 200 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 50 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 15 польскіх марак

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

У розных кутках сьвета падзеі астатніх дзён маюць трывожны і напружаны характар. Поўны спакой ніяк ня прыходзіць, і шмат дзе можна спадзявацца новае вайны.

Спрэчка **Літвы** з Польшчаю невядома чым скончыцца. Гіманс прыслаў ім новы свой праект згоды, але праект гэты не падабаецца Польшчы і ня можа быць прыняты Незалежнаю Літвою, затое што пагражаець небясьпекаю яе незалежнасьці. Праект гэты крыўдзіць і беларусаў.

У **Польшчы** адбываецца зьмена міністраў, там і тут пануюць работніцкія забастоўкі, расьцець дарагоўля. Разумнейшыя польскія людзі стараюцца за мір, згоду з суседзямі і паляпшэньне гаспадаркі. Але голас эндэкаў і шовіністаў маець там яшчэ вялікую сілу, і невядома, як выйдзе нашая суседка з цяжкога становішча.

У **Расеі** на Волзе — страшэнны голад ад засухі і бальшавіцкага бязладзьдзя. Увесь сьвет завінуўся памагаць галодным расейцам, ня гледзячы на стараньне белых расейскіх эмігрантаў зьвязаць гэтую помач з барацьбою супроць бальшавікоў. Даволі часта прыходзяць пагалоскі, што скора будзе вайна Савецкай Расеі з **Румыніяй**.

У **Няметчыне** вялікі неспакой у зьвязку з забіўствам правымі левага дзеяча Эрцбергера. **Баварыя** робіць сваю правую палітыку і ня хоча слухаць дэмакратычнага Бэрліна, не баючыся навет аддзяліцца ад усяе Няметчыны. Камуністы нямецкія карыстаюць з гэтага і страшэнна пашыраюць сваю прапаганду, так што могуць быць там вялікія разрухі.

Вялікабрытанія ня можа дайці ладу з ірляндзкімі сінфейнерамі, якія хочуць поўнай незалежнасьці **Ірляндыі** ад Англіі. У **Індыі** таксама паўстаньне супроць ангельцаў, але, здаецца, ужо заціснута вялікабрытанскім войскам. Англія, апроч таго, усё болей ня ладзіць з Францыяй з-за Горнай Сьлезіі.

Францыя абстаівае у горнасьлезскай спрэчцы Польшчу, каб посьле самой добра карыстаць вугальным раёнам і назгул аслабіць Няметчыну. Англія баіцца узмацненьня Францыі і цягне ў гэтай спрэчцы за Няметчыну.

У **Італіі** набіраюць моцы левыя партыі.

У **Юга-Славіі** — таксама. Там памёр стары кароль. Яго сьмерць камуністы хацелі выкарыстаць дзеля перавароту.

Супроць **Гішпаніі** паўстала **Марока.** Гішпанцы мелі шмат ваенных незадач, і там, як пішуць газэты, з дня на дзень можна чакаць рэвалюцыі.

Аб **Грэка-Турэцкай** вайне даходзяць глухія весткі, і трудна зразумець, на чыім баку перамога. Туркам (кемалістам) памагаець Савецкая Расея, а Грэкам — Антанта.

Венгрыя з Аўстрыяй войстра спрачаюцца за граніцы, так што недалёка было і да вайны. **Аўстрыя** зусім змаглася; грошы яе на рынку амаль нічога няварты.

Амерыка перажываець страшэннае безрабоцьце, бо фабрыкі, працаваўшыя на вайну, пазачыняліся. І там камуністы вядуць вялікую агітацыю і ў адным Нью-Йорку выдаюць некалькі сваіх газэт

Савецкая Беларусь выслала ноту Польшчы, што можа мець важныя насьледзтвы.

ЗЬЕЗД У ПРАЗЕ.

25 верасьня (сенцябра) у прыгожай чэхаславацкой Празе зьбяруцца прадстаўнікі беларускага народу, каб сказаць сваё важкае слова аб сваіх крыўдах. Калі ня будзе ні з чыйго боку ніякіх штучных перашкод, то зьезд будзе поўным, бо і тутэйшыя і загранічныя беларускія кругі падтрымліваюць зьезд. Зьезд павінен вырашыць вельмі важныя справы, якіх набралася ад часу апошняга сходу Рады Рэспублікі вельмі многа.

Няма беларускай дзяржавы..., а значыць і беларускага народу няма!

Беларусь падзелена, зруйнована, і над ёю робіцца самая брыдкая практыка чорнай—прачорнай палітыкі, якой яна ня бачыла яшчэ ніколі.

Як нейкі востраў сярод шырокіх прастораў этнаграфічнай Беларусі выступае «Савецкая Беларусь». Але што гэта? Незалежная дзяржава? Адна назва...

Самым цяжкім для вырашэньня і самым важным, як нам здаецца, будзе на зьезьдзе пытаньне аб паразуменьні усіх беларускіх палітычных кірункаў у справах дзяржаўнай палітыкі. Ні для каго не сакрэт, што у цяперашнія часы беларуская палітыка разьдзялілася на некулькі кірункаў, адзін з якіх імкнецца ўжо парваць са старымі незалежніцкімі паглядамі і пайці на пакуту, зложыць аружжа.

З другога боку, ня можна не адзначыць і таго, што патрэбны зьмены у складзе урадуючых кругоў.

Патрэбен агульны фронт. Ато адны папаўзуць у вадзін бок, другія ў другі, і ўся наша беларуская справа распаўзецца на шкоду кожнай паасобнай групіроўкі.

Зьезд у Празе павінен сабраць усіх і памірыць па грунце старых незалежніцкіх лёзунгаў.

Можна мець на гэта вялікую надзею.

М. К.

Нота Беларускага Савецкага Ураду да Ураду Польскага.

(*Пярэдрук з польскай соцыялістычнай газэты „Роботнік“ №243.*)

„У Беларускай Савецкай Рэспубліцы адчыніўся Камісарыят загранічных спраў. Камісарыят той у справах, абходзячых цэлую савецкую федэрацыю, падлягаець расейскаму камісарыяту. У справах-жа беларускіх—як чытаем ў урадовым паведамленьні—выступаець зусім „самастойна“.

Дагэтуль—чытаем далей у тым паведамленьні—толькі Польшча прызнала Беларусь і маець з ёю умову (гутарка тут відочна аб рыжскім дагаворы). У найбліжэйшы час прадвідзіцца заключэньне чарады ўмоў з Чэха-Славацыяй, Латвіяй і г. д.

Дагэтуль толькі польскія падданыя уважаюцца на Беларусі за чужаземцаў, маючых правы і гарантыі чужаземцаў. Усе іншыя чужынцы падлягаюць тым самым правом, што й савецкія падданыя, затое што з іхнымі гаспадарствамі Савецкая Беларусь ня маець умовы.

Дык вось-жа старшыня Рады беларускіх народных камісараў і камісар беларускіх спраў (загранічных — Рэд.), А. Чэрвякоў, выслаў 21-га жніўня (аўгуста) г. г. ноту пану Скірмунту (польскаму міністру загранічных спраў — Рэд.), закідаючы польскім ўладам, што не стасуюцца з § VII, ар. 1. міравога дагавору. Разумеецца тут параграф, каторы пеўніць беларускаму народу на зямлі польскага гаспадарства вольнае разьвіцьце культуры і роднай мовы. П. Чэрвякоў ссылаецца на перасьледаваньне беларускіх школ, каапэратываў, дзіцячых прытулкаў, навет чытаньня беларускіх газэт ані-ж не бальшавіцкіх.

Ноты гэтай пан Скірмунт не падаў у польскія газэты. Рады былі-б ведаць, што на яе адказаў. Даўно ўжо мы паказывалі, што палітыка польскіх ўладаў на так званых крэсах (узьмежках — Рэд.) — бясмысьлена і шкодна. Выступ п. Чэрвякова можа выгукнуць у польскага ўраду пробліск зразуменьня, якую карысьць маюць Саветы з той палітыкі.“

Што чуваць у сьвеце?

Аўтаномія для Індыі. Ангельскі урад рыхтуецца перагледзіць свае адносіны да спраў Індыі і надаць індусам шырокае самакіраваньне.

Міжнародны зьезд неграў. 31-га жніўня распачаўся у Бруксэлі міжнародны зьезд неграў з усіх краёў. Праграма зьезду такая: чорныя дзяржавы сьвету і іх адносіны да другіх народаў; эканамічная эксплатацыя чорных; адносіны да асобных людзей другіх рас. Рух неграў распачат у Злучаных Штатах Амерыкі, на чале стаіць негр з вострава Ямайкі Марк Гарвей. Цэль: вызваленьне чорнай расы ад белых і ад эксплаатацыі імі. Гарвей — чалавек інтэлігентны і адукаваны, ідэаліст. Адначасна стаіць ён на чале параходнага таварыства, якое варочуець капіталам у 5 міліёнаў, сабраным сярод неграў. Нядаўна ў Нью-Йорку Гарвей даводзіў, што хаўрусьнікі выйгралі вайну толькі дзякуючы падмозе чорных. Як-бы негры не пралівалі крыві, кайзер Вільгельм і дагэтуль сядзеў-бы на прастоле, а можа й ў дварцы ангельскага караля. А як за тое падзякавана? Неграм навет не пазволілі паслаць свайго прадстаўніка на міравую канферэнцыю. Настроеная гэткімі прамовамі, чорная раса пагражаець цяпер аружным паўстаньнем.

(„Вперед!“)

Заварушэньне ў Гішпаніі. Шмат гішпанскіх работніцкіх арганізацый распачалі забастоўкі, як запярэчаньне супроць вайны з паўстаўшымі ў Марока маўрамі. Часьць войска не паслухала загаду выехаць у Марока.

Вайна ці правакацыя? Усе газэты перапоўнены весткамі, што бальшавікі сьцягаюць на румынскую граніцу войска. Некаторыя з іх пеўняць, што вайна тут немінуча. На падставе вестак ПАТ-а, бальшавікі назначылі Тухачэўскага шэфам генаральнага штабу, а Троцкі цяпер ужо на Румынскай граніцы („В.“)

Адстаўка Вітоса. Польскі старшыня міністраў падаўся ў адстаўку. Мае быць зьмена міністраў.

Латвія супроць Польшчы. У канцы жніўня быў у Рызе літоўскі міністр загранічных спраў Пурыцкіс, дзе рабіў вайсковы хаўрус з Латвіяй. Латышскія газэты цяпер прыймаюць супроць-польскі кірунак і заклікаюць урад выйці з нейтралітэту. У Коўню-ж прыяжджаў латышскі старшыня міністраў Мееровіч, які сказаў, што між Польшчаю і Латвіяй няма нічога супольнага.

У Югаславіі. Белградзкая паліцыя арыштавала брата сербскага камуністычнага дэпутата Марковіча, які паразумеўшыся з правадыром харвацкіх соцыялістаў Радзічам арганізаваў камуністычны пераварот. Пачатак рэвалюцыі меўся быць 15 верасьня.

Вялікія страты расейскай культуры. Не пасьпела замуравець могілка вялікага расейскага поэта А. Блока, памершага ў Пецярбурзе ці то ад галоднае цынгі ці-то ад рака, як газэты паведамілі яшчэ аб сьмерці ў Азербейджане вядомага поэта С. Гарадзецкага.

Памёр і знамяніты прафэсар Пецярбурскага унівэрсытэту А. Введзенскі. Школу прафэсара А. Введзенскага прайшоў выдатны у філасофскай навуцы прафэсар М. Лоскі-беларус.

Грэка-Турэцкая вайна. Бюро Рэйтэра падало вестку з Сьмірны, быццам грэкі занялі Ангору, сталіцу кемалістаў (турэцкіх адраджэнцаў.)

Літва і Польшча. Гіманс уручыў афіцыяльна прадстаўнікам новы праект польска-літоўскага паразуменьня і даў абедзьвюм старанам 8 дзён часу на адказ.

Катастрофа пад Баранавічамі. З 25 на 26 жніўня пад Баранавічамі разьбіўся цягнік, прычым 9 чалавек вагонамі забіта і 23 ранена.

Змаганьне польскіх работнікаў.

„Пшэглёнд Поранны“ паведамляець з Кошыца (Пазнань): Тутэйшыя работнікі, абураныя дарагоўляю, абвесьцілі сваю дыктатуру над местам і ваколіцамі. Работніцкую ўладу прызналі бургамістр і урадовая паліцыя. Работнікі канфіскавалі прывезеныя на рынак прадукты і прадаюць іх па сходнай цане. Сяляне перасталі былі прывазіць сельска-гаспадарчыя прадукты ў места, дзеля чаго работнікі паслалі ў вёску свае аддзелы па ежу.

Паўстаньне ў Індыі.

З Калькуты паведамляюць, што ангельскае войска прыйшло ў паўстаўшыя правінцыі і выгнала паўстанцаў з некалькіх местаў. Паўстанцы адступаюць у горы.

Безрабоцьце у Амерыцы.

Амерыканскі хаўрус працы зьвярнуўся да 35.247 мясцовых работніцкіх арганізацыяў, каб змагаліся супроць зьмяншэньня платы, як мага.

У Амерыцы 5.500.000 безработных.

У Амерыцы набіраюцца бышыя салдаты на вайну у Марока.

Вайна Гішпаніі ў Марока супроць маўраў, якія змагаюцца за незалежнасьць, — не карыстаець спагадаю гішпанскага насяленьня і салдатаў. Пры мабілізацыі ў Гішпаніі адбываюцца паўстаньні і салдацкія бунты. На тое-ж, гішпанскія войскі некалькі разоў дужа пабіты маўрамі.

Гішпанія шукаець наёмных войскаў заграніцай. І вось гішпанскае консульства ў Нью-Йорку набіраець безработных быўшых амерыканскіх салдатаў ў „загранічны легіон“ на змаганьне з маўрамі, баронячымі сваю незалежнасьць стойка і рашуча.

На заклік гішпанскага консульства адгукнулася шмат ахвотнікаў з быўшых салдатаў амерыканскай арміі. Яны безработныя; за 90 сентаў у дзень гэтыя „патрыоты“ гатовы ехаць абы-куды й абы на што.

Ахвотнікі прыймаюцца на 5 гадоў за 140 доляраў.

(„Амер. Ізв.“)

АГЛЯД ДРУКУ.

Эндэцкія выкрутасы.

Польская эндэцкая газэта „Жэчпосполіта“ вядома сваімі нялюдзкімі і тымчасам бяскарнымі зьнявагамі беларускага і літоўскага народаў. Зрэдку яна пускаецца, аднак, на „больш паважныя“ доказы, што беларусы—гэта не беларусы, а палякі.

Так у № 244 варшаўскага выданьня гэтае газэціны зьмешчан артыкул п. Гжымалы-Седлецкага аб беларускіх вёсках Віленшчыны, у якім аўтор пішаць:

«Чуу іх (сялян), размауляючых з прадстаунікамі польскіх уладау. У мове іхнай знойдзецца відочна той ці гэты выраз ня польскі ці перакручаны, бо не гавораць: „колічына“, але: „канюшына“, скажуць: „кабан“ замест: „вепш“, „парсюк“ замест: „просяк“, але ня скажуць: „рож“, хацеушы гаварыць аб жыце, ня скажуць „кгорох“, але „кгрох“.

Далей п. Гжымала-Седлецкі прызнаецца, што ў тутэйшай мове ёсьць такія звароты, як: „быўшы“, „седзяўшы“ (мабыць, „сядзеўшы“?—А. М.), „ехаўшы“, „пачакаўшы“. Але яму здаецца, што гэта, аднак, не русіцызмы (?) а „якаясь тутэйшая формацыя, каторая тут „урабіўшы“-ся з невядомых прычын“.

На ўсю гэту эндэцкую „гавэнду“ адно можна сказаць, што п. Гжымала-Седлецкі з сваім артыкулам запраўды „урабіўся“, як дзіця. Можам яго упеўніць, што тыя-ж самыя сяляне з прадстаўнікамі расейскай ўлады стараліся, страха дзеля іудзейска, казаць не сваё роднае „жыта“, але „рожь“, не „гарох“, але „кгорохъ“. Радзім таксама яму пашукаць невядомых для яго прычын аб беларускай мове у школьнай беларускай граматыцы Браніслава Тарашкевіча, каторы тож паходзіць з віленскіх сялян „ў адлегагасьці 17—18 кілёметраў ад места“.

А. Мсьціслаўскі.

Нацыянальная зьнявага.

Адкрытае пісьмо Старшыні Беларускага Камітэту ў Варшаве А. Дубяйкоўскага.

Паважаны Пане Рэдактар!

Вельмі прашу замесьціць у паважанай Вашай часопісі вось што:

Дня 6 жніўня г. г. прыбыў я ў Горадню у справах дабрачынных і асьветных. На мейсцы даведаўся, што гэтага-ж дня сьледчая паліцыя робіць аблаву на беларусаў, сярод белага дня перэтрасае памяшканьні і „падазроных“ арыштуець.

Зьявілася да мяне п. Кузьняцова — Курбская, матка заарыштаванага, прасіла памагчы і даведацца у мясцовай улады аб прычыне арэшту яе сына

З увагі на бедную, старую ўдаву і адабраньня ад яе адзінага сына, апякуна і падпоры старасьці, а будучы Старшынёй Беларускага Камітэту ў Варшаве, быў змушаны з ураду споўніць яе просьбу, тым болей, што арыштаваны быў вучыцелем у маёй школе.

Удаўся да Сьледчага Ураду, гдзе мяне паінфармавалі, што прыказ аб арыштаваньні Уладзіміра Курбскага, б. студэнта, паходзіць ад Старосты, а справай той кіруець Начальнік палітычнага аддзелу п. Іоткоўскі, сэкрэтар пры Старостве.

Скіраваўся да Староства, але з поваду нядзелі не знашоў нікога, апроч стаража, каторы і сказаў мне адрэс п. Іоткоўскага. Представіўшыся, кім я ёсьць, запытаў прычыны арэшту Курбскага.

„Ня ведаю, ці арыштаваны“ — адказаў п. Іоткоўскі. Тут-жа радзіў мне забраць з прытулку беларускіх дзяцей, которыя жывуць у Барыса-Глебскім кляштары, дзе знаходзіцца, як ручаўся п. Іоткоўскі, запраўднае гняздо бальшавізму. Я-ж асьведчыў, што асоба, каторую відзіць пан перад сабой, і ёсьць апякун гэтага прытулку бедных дзяцей, а кіраўнічка прытулку п. Станіслава Буйло ёсьць асоба з грунту шляхетная і пачцівая, нямаючая нічога супольнага з бальшавізмам; а што тычыцца дзяцей, дык ня можа быць і мовы, каб былі бальшавікамі.

12617 27648 42

З болем сэрца пакінуў памяшканьне Начальніка і удаўся шукаць п. Старосту. Аказалася, на мае няшчасьце, што Староста п. Рогалевіч ня быў на той час у Горадні, заступаў яго п. Стэмпнеўскі, рэфэрэнт самаўрадаў, да каго і зьвярнуўся.

На пачатку назваўся, кім я ёсьць, і прасіў выясніць, што было прычынай арэшту Курбскага. „Не магу сказаць, дзеля таго што гэта магло-б пашкодзіць у дальнейшых арыштах беларусаў"— адказаў п. Стэмпнеўскі. На другі дзень давядаўся я ў Старостве ад п. Юткоўскага, што арыштаваньне Курбскі цяжка абвінавачваецца і што справа яго будзе перададзена Пракуратуры. Напісаў просьбу да пракуратара, просячы прысьпяшыць следатва, і дастаў паведамленьне, што справа Курбскага перададзена на разбор да сьледчага судзьдзі I рэвіру пры Акружным Судзе.

Пры выясненьні справы у сьледчага судзьдзі устанавіў я, што доказамі матар'яла, забраны у час рэвізіі памяшканьня Курбскага, гэтакі: 1) колькі штук кніжак для беларускіх заграніцчных пашпартоў, пакінёных у Курбскага Дэлегатам Беларускай Рады, у час наступу бальшавікоў эвакуаваным з Менску у Варшаву, каторы часова урадаваў у Горадні да прыходу туды бальшавікоў і 2) колькінаццаць вайсковых пасьведчаньняў, каторыя асталіся ў Курбскага з часу урадаваньня яго ў ролі вярбункавага інструктара пры Беларускай Камісіі Вайсковай, каторая ў м-цу траўню г. г. ўжо зьліквідавана. Відаць ясна, што доказаны матар'ял зусім легальны і не дае поваду да абвінавачаньня і арыштаваньня Курбскага, на што праўнік зусім згодзіцца. Але паміма гэтага, — знаходзіцца іншы матар'ял — роблены, галаслоўны і ганебна вінавацячы Курбскага — гэта акт, створаны палітычным аддзелам пры Старостве.

Поводле акту Курбскі мае быць членам якойсь соцыял-рэвалюцыйнай маёсовай партыі, заданьнем каторай ёсьць аддзяленьне незалежнай рэспублікі беларускай на землях, каторыя паводле трактату у Рызе апынуліся ў граніцах Польшчы.

Дзеля такога наслупнага і змысьленага абвінавачваньня прасіў я судзьдзю дазволіць відзецца з арыштаваным, а як толькі гэта атрымаў, напісаў на імя Пракуратара жальбу, каторую Курбскі у прысутнасьці адміністрацыйнай турмы падпісаў.

Па аканчаньні гэтых спраў меў я паехаць з Горадні. Тым часам сьледчая паліцыя перад самым маім ад'ездам на станцыю абкружыла дом, у каторым знаходзіцца дзіцячы прытулак, гдзе праз колькі дзен і я прабываў. Начальнік паліцыі пасылаў два паручэньні заступніка Старасты п. Стэмпнеўскага: адно адносілася да дзіцячага прытулку, каб у ім зрабіць дэталічную рэвізію, другое ужо — да мяне. Згодна з прыказам п. Стемпневскага абявязкам паліцыі было спраўдзіць мае асабістыя дакументы, але, апроч таго, калі-б я ня меў зв. карты побыту на м. Горадню, — арыштаваць мяне і пад канвоем адаслаць этапам да распараджэньня Камісару Урада м. ст. Варшавы.

Асабістасьць маю сьцьвердзіў я дыплёматычным пашпартам, выданым праз Польскае Міністэрства Заграничных Спраў; карты побыту на моцы таго дыпляматычнага пашпарту не аплачываю навет і ў Варшаве, гдзе ўвесь час пражываю.

Аднак, кіраўнік сьледзтва, паміма сьцьверджаньня маёй асобы, быў суровым выканаўцам прыказу Старасты. Прасіў яго, каб пусьціў мяне для прадстаўленьня маіх дакумэнтаў асабіста ініцыятару прыказа п. Стэмпнеўскаму. Пазволіўшы мне на гэта, пусьцілі мяне пад канвоем шукаць па месьце п. Стэмпнеўскага. У якойсь кавэрні знайшоў яго у кампаніі колькіх асоб. Зьвярнуўся да яго з просьбаю, выказываючыся асабістым довадам. „Я толькі выканаўца прыказу — напраўляе гэта ваявода з Беластоку" — адказаў п. Стэмпнеўскі, а да варты дадаў: „прыказ мусіць быць сьцісла споўнены".

Бачыў я, што няма ніякай рады. Быў змушаны паддацца самаволі і пайсьці з кавэрні пад канвоем да арэшту. Трымалі мяне больш як суткі і аж з трэцім цягнікам адаслалі да Беластоку, куды прыехалі у 2 с пал. гадзіны начы. Дзеля позьнае пары, варта, ня ведаючы, дзе мяне памясьціць, завяла да паліцыі 3-га рэвіру, дзе зьдзекаваліся нада мною, стараючыся зрабаваць мае кішэні. Каля 9-й толькі гадзіны быў выданы я ў рукі сьледчай экспазытуры дзе пасьля суровага сьледзтва і сьпісаньня пратаколаў — зволыйілі.

Адпачыўшы, пашоў я у рэстаўрацыю, каб заспакоіць голад. Толькі пасьпеў спажыць пасілак, як убачыў перад сабой таго-ж самага ўрадніка экспазытуры, каторы мяне звольніў. „Мусіце вярнуцца са мною да экспазытуры. Затэлефанавана да нас з Горадзенскага Староства каб Вас не звальняць, а адаслаць пад канвоем у Варшаву". Пасадзілі мяне узноў пад арэшт, а ў начы адаслалі цягнікам у Варшаву і аддалі ў распараджэньне Камісара Ураду.

Паказаныя факты аж надта ільлюструюць, як урадуець польскі урадпік на землях з беларускай людпасьцю. Гэта ёсьць страшны трагізм: кожны, хто называець сябе беларусам, ужо праз гэтае сама робіцца ўваччу адміністрацыі праступнікам супроць польскай дзяржаўнасьці. Кожная беларуская арганізацыя, ці то культурная, асьветовая, хрысьціянская, дабрачынная, прамысловая, гаспадарчая ці гандлёвая—прадназначаецца загадзя адміністрацыяй на зьнішчэньне. Кожны беларус, як і цэлыя арганізацыі, ня толькі наводзяць на сябе падазрэньне у бальшавізьме, але прост называюцца бальшавікамі, каб воража і рэпрэсыўна ўспасобіць гэтым у адносінах да беларусаў увесь польскі народ, а таксама і сфэры правадаўчыя і ўмяркаваныя.

Людпасьць беларуская крыўдзіцца забаронай для яе легальнага жыцьця, з аднэй стараны правакуецца да робленьня праступкаў, а пасьля з другой—душыцца ўсімі рэпрэсіямі за розныя западазрэньні і нелояльнасьць да Польшчы.

Уважаю, што незьвяртаньне ўвагі на гэтыя адносіны ня толькі руйнуе спакойнае жыцьцё беларусаў, але так сама, падрываючы агульны аўтарытэт, уплывае руйнуючым способам на арганізм Польскага гаспадарства.

Не магу на часіну дапусьціць, каб гэты парадак рэчаў меў астацца надалей, каб ня было кары на тых, што ўпраўляюць самаволяю з уласнай ініцыятывы, і каб перастала панаваць права ў Польскім гаспадарстве.

Ня хочацца верыць, каб Польшча культуральная, дэмократычная, хрысьціянская, прававі тая і правадаўчая, маючая напісаную конституцыю, гарантуючую роўнасьць перад правам усіх нацыянальнасьцяў у гаспадарсьцьве — сьвядома падтрымовывала самаволю адміністрацыі для трыманьня ў няволі і рэпрэсій супроць беларусаў у сваім гаспадарсьцьве.

Лявон Дубяйкоўскі

*Старшыня Беларускага Камітэту у Варшаве.**)

Дапіска Рэдакцыі. Лявон Вітэн-Дубяйкоўскі, архітэктар,**) зьяўляецца адным з найстарэйшых беларускіх дзеячаў. Удаўшыся ў астатнія гады ў палітыку, ён быў вядом, як чалавек так званай польскай арыентацыі (спадзяваўся вызваліць Беларусь дружбай з Польшчаю). Ня гледзячы на розьніцу ў палітычных паглядах, ён дужа паважаецца ўсім-чыста беларускім грамадзянствам, як асоба крышталыпа чыстае душы. Выказуем яму самую глыбокую і шчырую спагаду, а разам з ім і ўсім тым пацярпеўшым братом, якія навет ня могуць голасна, ў газэтах, сказаць аб сваіх крыўдах, а ня раз цярпелі яшчэ горш за п. Л. Дубяйкоўскага. Хочам верыць, што польскі ўрад належна пакараець зьняважаўшых п. Л. Дубяйкоўскага асабіста і як Старшыню Беларускага Камітэту ў Варшаве.

Ніжэй друкуем верш п. Л. Дубяйкоўскага, напісаны ў 1893 годзе ў самы страшны час расейскай рэакцыі.

Бура.

Стогне віхр, гудзе у полі,
Гне сталетнія дубы.
Плачуць людзі з горкай долі—
Недзе дзецца ад журбы.
Вые віхар бязупынна,
Дрэвы верне з каранём.
А дзе-ж гэтаму прычына?
І навошта мы жывём?
Калі-ж хмары перастануць
Зацямняці нашы дне?
Калі-ж праўда зноў паўстане
І прамень сьвятла блісьне?
Калі-ж мы ў думцы згоднай
Устанем край свой бараніць,
У Беларусі--Маці роднай,
Як браты, пачнема жыць?
Ой, ня плач, гаротны людзе,
Бо шкада-ж нашых вачэй
Посьле буры ясна будзе,
Заіграе дзень ярчэй.
Калі б хмары ня шумелі
Навакол нашых сяліб,
Калі-б гора мы ня мелі—
Без свабоды памярлі-б.
Скора прыдзе да нас воля!
У родным краю—паміж нас—
Заясьнее шчасьце, доля,
Будзе сьвята—вялік час!

1893 г.

Лявон Вітэн-Дубяйкоўскі.

*) Тут зьмешчан пераклад пісьма з газэты „Глос Літвы", затое што пісьмо, пасланае п. Дубяйкоўскім у бел рускія газэты, яшчэ ня прышло з Варшавы

**) Беларускае настаўніцтва Віленшчыны магло пазнаеміцца з ім на яго селетніх лекцыях аб беларускай архітэктуры на Вучыцельскіх Курсах у Вільні.

Літоускі Статут

(Беларускія законы).

Літоўскім Статутам называецца знамяніты зборнік даўных законаў Літоўска-Беларускага гаспадарства.

Законы гэтыя спрадвеку былі ў сьвядомасьці беларускіх і літоўскіх пляменьняў; яны разьвіваліся, дапаўняліся і пераходзілі з рода ў род праз ужытак іх на практыцы.

У пачатку 16-га веку нашыя выдатныя законьнікі сабралі іх, апрацавалі згодна з правам усіх эўрапейскіх народаў і запісалі ў зручным для карыстаньня парадку. Скончылі яны сваю працу ў 1529 годзе.

Літоўскі Статут адразу здабыў сабе славу. Цераз год яго пераклалі з беларускае мовы на лацінскую, а цераз тры гады на польскую.

Дзеля некаторых зьмен у гаспадарственым ладзе стары беларускі Статут быў пазьней перагледжаны. У другой рэдакцыі ён быў зацьверджаны на віленскім сойма ў 1566 годзе.

Люблінская вунія нашае бацькаўшчыны з польскім каралеўствам прынесла, як ведама, яшчэ большыя зьмены ў праўных адносінах у Беларусі і Літве. І вось Літоўскі Статут быў ізноў перагледжаны асобнаю камісіяй пад старшынствам ведамага канцлера Лявона Сапегі і зацьверджаны соймам у 1588 годзе.

Статут 1588 году быў надрукаваны ў віленскай беларускай друкарні слаўных братоў Мамонічаў. Адна кніжка ёсьць цяпер у Беларускім Нацыянальным Музэю Луцкевіча ў Вільні.

Мова Літоўскага Статута служыць прыкладам урадовае беларускае мовы 16-га веку, а ўвесь Літоўскі Статут ёсьць нязвычайна дарагой памяткай нашае слаўнае мінуўшчыны.

Літоўскі Статут сьведчыць аб высокім разьвіцьці беларускае культуры. Гэты зборнік законаў бараніў адзінства і самастойнасьць нашае бацькаўшчыны.

З Літоўскага Статуту у рэдакцыі 1529 г.

РАЗЬДЗЕЛ ПЕРШЫ.

Будучі в Полшчы не маем' нічого нікому даваті ані прівілеев' потвержаті.

25. Теж уставуем, іж от того часу мы самі (кароль, вялікі князь) і потомкі нашi будучі в' панстве нашом короне полской немаем нікому нічого в панстве нашом веліком Князстве Літ. іменей людей і земль даваті і первых данін' кому будет далі потвержаті, ніжлі мы самі і потомкі будучі у веліком Князстве подданым нашім маем даваті і обдароваті подлуг іх заслуг, і прівілев' на вечную реч не маем інде нікому даваті оліж' кгды будем' весполок' с паны радамі нашімі на валном' соймі. А так еслі бы хто после тое уставы нашое якокольвек в нас люді і землі кгды будем в Полшчі упросіл, або первую даніну нашу прівільем нашім' потверділ таковые лісты і прівіля нашi ні увошто оборочаем і не маем іх мы самі держаті і потомкі нашы, ніжлі што ся дотычет куплі кождому везде і у панстве нашом' коруне полской будучі маем' то потвержаті.

Плач старога лясуна.

Гулка грымелі ў бары тапары,
Гулка грымелі з зары да зары...
З стогнам пакутным валіліс сасонкі,
Стан распраўляючы стромкі і тонкі.
У частым чушчары шырокай лагчыны
Моўчкі, жахліва дрыжэлі асіны...
Бор вырубалі... Ад краю да краю
Рэха няслося... З нядолі, адчаю
Сьмягнулі травы уздоўж каляіны,
Там дзе начніцам калісьці тканіны
Месяц ды белы туман разам ткалі,
Там, дзе імлы калыхаліся хвалі...
Бор вырубалі... Нястройна, балюча
Гул нёсься ў даль пераз сьметніка кучы,
Нёсься праз сьвежыя пні залатыя,
Нёсься у нетры дзікія, густыя..

* * *

Плакаў чарот над іржавым балотам,
Кракаў крумкач чарнакрылы пралётам,
Шэрыя совы, што ночкай лятал,
Плакалі й тыя, што бор вырубалі...
Не, то стагналі там, пеўна, ня совы,
Плач той быў дзікі, галосны і новы, —
Плакаў, прысеўшы на пні і галіны,
Стары лясун у начныя часіны...
Плакаў лясун, абціраючы вочы...
Сьлёзы, бы зоры у восень, у ночы,
Часта зрываліс, па шчоках каціліс,
У зморшчынах чыстай расою іскрыліс...
Хмарыліс горка калматыя бровы,
Вусны крывіліс, і новыя словы
Рваліс з магутных грудзёў лясуновых,
Рэхам каціліс да пушчаў цярновых...

* * *

Плакаў лясун, што лясы высякалі,
Шэпты начы новы плач выгукалі.
Доўга хадзіў ён, хадзіў неспакойны,
Там, дзе учора спаў бор яго стройны.
Вецер, разьвеяўшы космы сівыя,
Аж па над хвоі кідаў іх густыя,
Блутаў у рэдкіх сасон верхавінах,
Блутаў, ірваў, зачапіўшы ў галінах...
У доўгай кашулі з імхоў сіваватых,
Мокрых вялікіх лапцёх кучмаватых,
Падперазаўшыся гнуткай лазою,
Брыў ён заснуўшаю сьцежкай лясною,
Брыў і трышчэў па суках і па трэсках,
Брыў і ламіўся па тых пералесках,
Дзе яшчэ сосны шумелі, зьвінелі,
У неба глядзеці далёкае сьмелі...

* * *

Ходзіць лясун, уздыхаець пакутна,
Ходзіць па лесе то-ціха, нячутна,
То зазлуецца, ламаець галіны,
Гнець пад нагамі бярозкі, асіны...
Трэск ідзе борам... Пужлівыя совы
У дуплях хаваюць сьляпыя галовы,
Шэрыя зайцы лятуць і касяцца:
Дзе-бы ім лепей, пясьмелым, схавацца,
Людзі, пачуўшы з-пад бору раскаты,
Шэпчучы пацеры, мкнуцца да хаты,
Вецер у тон лясуну запявае,
Першае жоўтае лісьце зрывае,
Круціць у ночным вільготным паветры,
Круціць, заносіць далёка у нетры...
Доўга лясун гэткай ночкай злуецца,
Доўга равець ён, пакуль ня уймецца.—

Натальля Арсеньнева.

1921 г. Вільня.

У 1920 годзе.

(*Апавяданьне народнага чалавека*).

Дзеля важных патрэб нашай народнай справы я перахадзіў у восень 1920 году польска-маскоўскі фронт і адну ноч быў у нейтральным пасе.

У запэцканай і затхлай каморцы заезнага месьцячковааа двара праспаў я ня меней, як гадзін пятнаццаць ўзапар, і прапшнуўся ад гоману двух мужчынскіх галасоў у сумежнай каморцы. Мяне аддзяляла тонкая драўляная адгародка, і ўсю размову было ясна чуваць. Аднак, заняты цяжкімі думамі аб сваім прапаўшым правадніку, я доўга не зьвяртаў на гамонячых ніякае ўвагі.

Сон мой быў трудны і кашмарны. На запыленым шкле маленькага вакна, дачакаўшага ўрэшце некалькі жоўтых косак захадзячага восеннага сонца, бесьпярэч білася, зьвінела і паміpала адзіная жывая муха, і з яе кавэнчаньнем зьвязаўся мой сон, поўны ўспамінаў аб учорашнім пераходзе маскоўскага фронту.

За невялікія гоні ад нейтральнага пасу мы трапілі пад абстрэл і мусілі дзьве бясконцых, вечных гадзіны ляжаць у балоце між купнікў.

Праваднiка майло, селяніна з бліжэйшай вёскі, сьвядомага, адданага ўсёй душою нашай справе чалавека, калі ён пакінуўшы мяне ў вадзе, папоўз на бераг у разьведку,—схапілі чырвонаармейцы-маскалі і б'ючы прыкладамі пагналі ў свой штаб. Мы разьлічалі, што ён сустрэнецца з чырвонаармейцам-беларусам, які пры маім першым пераходзе памог мне пераправіцца. Але іх відаць ужо зьмянілі, рахуба наша ня спраўдзілася, і чалавек прапаў.

Думка аб ім цяпер страшэнна мучыла мяне. Я хаваўся ў яго хаце, ідучы на ўсход, цэлых тры дні; пазнаў яго сям'ю; прывязаўся к яго дзеткам, якія міла дэкламавалі мне „Ад веку мы спалі",—і вось цяпер прадстаўленьне аб іх пакутуючым для іх сіроцтве мучыла мяне, атручала маю радасьць, што сам уцёк з пад вока маскоўскае старожы і копіі ўсіх важных пастаноў Глаўнае Рады нашых усходніх арганізацый, зашытыя ў падкладцы пінжака, вынес сюды цэлымі (пальто кінуў у балоце).

— „Што цяпер падумае Аўдоцьця аб народных людзях, пагубіўшых яе мужа? А яна-ж гэтак старалася прыслужыцца мне, гэтак пільнавала накарміць мяне ўсім-чыста лепшым, што толькі было ў іх, каб хоць гэтак паказаць сваю бабскую спагаду „народнай справе". І вось я, „важны народны чалавек", як яна з пыхаю хвалілася сваёй матцы, я мімаволі зрабіўся прычынаю яе вялікага гора".

— „Каб толькі не растралялі, а там неяк удасцца яго вызваліць",—не выхадзіла ў мяне з галавы думка аб праваднiку.

А растраляць яго маглі, бо ўжо мелі на падазрэньні як „беларускага верхавода" сярод акалічных сялян, варожа настроеных супроць маскоўска-бальшавіцкага наезду.

Быў у мяне і другі клопат: трэба яшчэ перабрацца цераз польскія заставы, надта ласыя да грошы і спатвораныя сьпекулянтамі, бесьпярэч вольна параяжджаючымі фронт.

А грошы ў мяне засталося мала: дзесяць тысяч савецкіх рублёў, адна царская пяцісотка і дзьвесьце польскіх марак.

Я разважаў: ці здаволіцца польская варта на фронце пяцісоткай і ці можна рэшту грошы пакінуць гаспадару заезнага двара, каб пераслаў сям'і праваднiка?

У гэты мамэнт гоман за сьценкай павялічыўся: там таксама спаміналіся царскія, думскія, савецкія, польскія...

Спачатку мне здавалася, што хваляцца адзін аднаму сваімі грашавымі аперыцыямі сьпекулянты, якіх поўна было на заезным двары па дарозе з Вільні ў Менск і з Менску ў Вільню.

Але я ашукаўся.

— І вось, браце мой мілы,—казаў адзін з гаманіўшых,—вырваўся-ткі я з гэтага пекла, а разам і ад сваіх каханак.

— Ну, а як-жа твая школа?—спытаўся ў яго сябра?

— Школа?., Хай яна згарыць. Цэлае лета ня мог выехаць, мусіў то пры ёй сядзець, то езьдзіць на розныя курсы і зьезды па народнай асьвеце. Наастатакк адвялі мне так званую школьную дзесяціну, і каб я на ёй сам рабіў ды яшчэ й мужыкам паказываў, як і што належыць пакультурнаму. А тут жраць няма чаго, прыладаў земляробскіх ніякіх ня выдалі... Пальцам я буду зямлю капаць ці што? Узяў і ўцёк у Польшчу, хай яны згараць з сваімі парадкамі!

— Так... Ну, а як-жа цяпер твае каханкі?

— З імі чыстая бяда, браце мой мілы.

— Плачуць па табе?

— А хвароба іх ведаець! Справа ня ў плаканьні, а ў тым, што наастасак прыціснулі мяне ў кут, каб жаніўся. Ці йметш веры?—мусіў хавацца ад мужыкоў. Выхажу я ад аднэй, а бацька другой пільнуець, каб мяне злавіць і ўзяць, казаў той на цугундзер...

— Як-жа ты гэтулькі іх разам меў?—сьмяецца другі сябра.

— Як?—тут завядзеш хоць сотню, калі жраць няма чаго. Ты разумееш: савецкага жалаваньня вучыцялю хапаець на якіх пяць хунтаў хлеба. А мужыкі зажырэлі, цэлыя мяхі набілі грошы,—вучыцялю-ж ці там на школу каб хто даў—то ні кап'я! Па старэй памяці: школа казённая, дык палена дроў ніхто ня дасьць клясу пагрэць,—казна павінна даваць. Вось як яны гавораць. Віджу я, што трэба зусім прапасьці або пайці на якія хітрыкі. Ну і пайшоў. Зайду к аднаму гаспадару, дзе ёсьць нішто сабе дзявуля, і пачну дурня ламаць, і пра каханьне, і пра вясельле, і пра тое, што ўсе цяпер роўныя, дык вучыцелю ня грэх і з добраю сялянкаю пабрацца.. Развесяць яны вушы, думаюць: „А можа й праўда, ажэніцца з нашай курноскай?" І ну мяне частаваць, і ну мяне падкармліваць, тут табе і сала, й сыру, і ўсякага ліха...

— Якога-ж ліха?

— Вядома, якога: доўга-ж бакі забіваць ня ўдасцца, трэба канчаць або ўцякаць. Пакручуся, пакручуся і пачынаю камэдзь гуляць з другою потым з трэцяю. І так разьвялося іх у мяне ў нашай акрузе дзесяткі два. Дайшло да таго, што не магу носу нідзе паказаць: бацькі ловяць, прыстаюць, калі-ж вясельле думаю рабіць? Дзеўкі паміж собку сварацца тая на тую зводзяць, асла ўляюць, на мяне наракаюць. Адным словам, зрабіўся я быццам заводзкі бык на скотнай ферме раданькі сабе даць ня мог.

— Але-ж выкруціўся?

— Насілу, браце мілы! Адна гарачая ня, ўдзержылась і зацяжэла. Прыходзіць што нядзелячкі да мяне з бацькам ці з маткаю, прыступаець з нажом к горлу: жаніся! Плача, галосіць, то просіць, то паграживаець у савет пажаліцца.

— О, то гэта ўжо ня жарты!

— Якія, чорта, жарты... Пажаліўся-ткі бацька на мяне у савет, што дзеўку зьвёў, а жаніцца не хачу. Гукаюць мяне, раба божага, на пакуту.— „Што-ж вы, таварыш-настаўнік, робіце, — кажа камісар,—мы вас прымусім з ёй жаніцца".—І прымушаць,—кажу,—ня трэба, таварыш-камісар, хай хоць зараз ідзець да мяне ў жонкі". Камісар мой і асекся".—„Чаго-ж яны жаляцца?"—Ня ведаю,—кажу яму,—мабыць, хочуць царкоўнага вянца, а я хоць беспартыйны, але камуніст у душы і пры-

РАЗЬДЗЕЛ ЧАЦЬВЕРТЫ.

О девкі, которые будут' выданы до чужое землі.


10. Теж' уставуем, естлі бы которая девка панства нашего велікого Князства Літовского пошла до чужое землі до Полшчы або до Мазовш' або до которое колве землі, маючы імепя отчізные і матерістые в панстве нашом веліком Князстве Літовском; тогды тая девка с' тым мужом своім чужоземцом не мает дедічіті в тых іменях своіх' тыя імене ее отчізные і матерістые мают пріті на стрыев' рожоных', а не будет лі стрыев, іно на блізкіх ее, а оні не повінні ей будуть пасагу даті, яко в' тых правех опісано девком зыменей і четвертое часті даваті.

З друкаванага Літоўскага Статуту у рэдакцыі 1588 г.

АРТЫКУЛ' ПЕРШЫ.

Всі обывателі велікого Князства літовского тым одным' правом' пісаным, і от нас' даным' сужоны быті мают'.

Напрод' мы гедр' обецуем' і шлюбуем', под' тою ж' прісегою, которую учінілі есмо всім' обывателем', всіх' земль паньства нашого Велікого Князства Літовского, іж' всіх' княжат' панов' рад, духовныхь і светскіх, панов' хоруговных' шляхту, места і всіх' подданых' нашіх', і всіх' станов' в том панстве нашом' велікомь князстве літовском', і іных, всіх' земль, здавна кутому паньству прісл-хаючіх', почон'шы от вышшого стацу аж до ніжшого, тымі одными правы і артыкулы, в том' же статуте ніжей пісанымі, і от нась даными судіті і справоваті маем' также чужоземьцы заграніччнікі велікого князства літов'ского, пріеж'дчые і якім' колвек' обычаем' прібылые люді, тым же правом' мают' быть сужоны, і на тых' врадехь где хто выступіт'.



Друкаваны Літоўскі Статут 1588 года па экзэмпляру з Беларускага Нацыянальнага Музэю імя Я. Лукевіча ў Вільні.

АРТЫКУЛ ДРУГІ

Мы гедр' шлюбуем' нікого не караті на заочное поведаньне, хотябы дотыкалося маестату нашого госдрского...

Подлуг — па, згодна (з заслугамі). Індe — яшчэ гдзе у другім месцу. Всcподок' — супольна, сумесна, разам. Дедічіті — даставаць права на спадчыну, маемасьць. Стрыев' — дзядзек. Зыменей — з маемасьці.

Напрод — найперш, наперад. Шлюбуем — дэкляруем. Почон'шы — пачаушы. Врадехь — урадах, установах. Маестату — дастойнасьці.

знаю толькі вольнае сужыцьце з жанчынаю". Няма яму чаго казаць, відзіць, што наскачыла каса на камень"...

Субяседнікі парагаталі, потым на нейкі час змоўклі, як бы прыслухаліс да маей сьценкі.

— Як чалавек захоча спаць, то й гоману не пабаіцца, — пачуў я голас вучыцеля; — ды й ня так-жа мы голасна гамонім,—дадаў ён.

— Гаспадар папераджаў, каб цішэй былі: там сьпіць нейкі праезны пан.

— Ат, нічога...

Яны нешта пілі, можа ханджу, і заядалі драчонамі, хвалячы іх, курылі дужа сьмярдзючую табаку, харкалі, плявалі, шарпалі нагамі і за гоманам ня чулі, як я асьцярожна адчыніў фортачку і пусьціў у камору сьвежае паветра. За акном на сьцяне пуні яшчэ стаяла астатняе сонца. Гдзесь з боку тупаў конь і зрэдка далятaлі галасы — гаспадара-крамніка ці яго і якога-небудзь мужыка. Потым усё сьціхала на даўгі час, дзеля таго што ў будні дзень сяляне у мясьцечку рэдкія госьці.

— Ну, а як-жа, браце мілы, ты?—спытаўся той, што ўцёк з-пад бальшавікоў. Ен быў у радасным пад'ёме, толькі што пераказаўшы, як за малы хабар бальшавіку шчасна перабраўся цераз фронт, а жыдоў, што йшлі з ім разам, злавілі і павялі у штаб,

— Я? — перапытаўся акупаваны Польшчак, набраў паветра повен рот і шумна выдыхнуў, відаць, рыхтаваўся гаварыць з прыемнасьцю й падробна. — Я „прымазаўся" да беларусаў, дастаю паёк у беларускай вайсковай арганізацыі і пакуль што—гора ў край! Цяпер прыехаў вось сюды вербаваць ахвотнікаў.

— Чакай,—перабіў вучыцель, — то, можа-б, ты й мяне завербаваў. Што для гэтага патрэбна? Я тожа беларус.

— А нічога,—адказаў яму вярбоўнік,—толькі язык прыдзецца трохі паламаць...

— І ўсяго? Дык мне гэта ня страшна, з каханкамі я толькі пабеларуску й гаманіў.

— А пісаць пабеларуску ўмееш?

— Спрабаваў. У нас пайшлі былі пагалоскі, што будзе Беларусь, дык прыдзецца у школах навучаць пабеларуску. На зьезьдзе ў Гомеле загадчыкаў народнае асьветы штосьь такое пастанавілі, але прыказу вучыцялём ніякага ня было, дык я і кінуў. Я навет літэратуру беларускую трохі знаю. Чуў ты калі „Тараса на Парнасе"?

— Не, а што гэта за штука?

— Ну, слухай:

Ці знаў хто, брацц‍ы, з вас Тараса,
У палясоўшчыках што быў, —
На Пуцявішчы, ля Панаса,
Ен там ля лазьні блізка жыў.
Што-ж, чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губу ён ня браў...

— Стой!—спыніў яго афіцэр,—дык ты ў нас зараз дзеячам беларускім будзеш. Я, прызнацца, не шаную гэтай мовы: дык, няхай, чаго... адно сьвінства!

— А як-жа ты вярбуеш? Трэба-ж, мабыць, агітаваць за Беларусь?

— Ха-ха-ха!—зарагатаў вярбоўнік.—Вы там прыймаеце усё ў сур'ёз і думаеце, што мы запраўды робім тут якую-сь Беларусь! Гэта-ж адна камэдзія, каб палякі давалі пайкі і грошы. Якога чорта я завярбую,—калі ніхто із мужыкоў ня пішацца. Сам народ ня хоча ніякай Беларусі.

Вучыцель у вадказ маўчаў, мабыць, ня згодзіўся з паглядам сябры.

— Ну, не, браце мой мілы — сказаў ён памаўчаўшы,—мне, здаецца, што яна будзе. Надта-ж пільна некаторыя узяліся за гэту справу. Ты ведаеш, што навет у нас там завяліс цяпер такія заядлыя беларусы, што скажы яму наўпроці хоцьбы жартам, руку ня будзе падаваць.

— Дык і ў нас хапаець падобных ідыотаў, але-ж мы з іх толькі пасьмяхаемся. А што яны зробяць бяз войска?

— Што войска? Цяпер і з войскам рады не дасі. З аднаго боку бальшавікі, з другога палякі Але я ведаю добра, што беларуская агітацыя страшэнна шырыцца. У нас увесь народ за беларусаў, хоць другі дагэтуль і ня ведаў, што ён таксама беларус. За беларусамі цяпера пойдзець кожны селянін, бо ад іх толькі ён і спадзяецца добрага.

— Дык чаму-ж ты яшчэ не ў беларусах, гэткі гарачы?—насьмешліва і нездаволена спытаўся афіцэр. Як будзе ядзіная недзялімая Расея, то я й цябе адным заходам пастараюся павесіць.

— Мабыць, я гэта прадчуваў, затое вось высьцярагаўся,—жартам адказаў вучыцель. — А ўсё-ж ты мяне завярбуй у сваё беларускае войска па старой дружбе.

Тут гутарка субяседнікаў узьбілася на ўспаміны аб іх даўнеўшай службе ў адным палку, і я перастаў іх слухаць.

У дзьверы маей каморкі пастукалі. Прыйшоў з таёмным відам гаспадар, а з ім разам падводчык віленскіх жыдоў-сьпекулянтаў.

Гаспадар памог мне ўмовіцца на падарожу з забасьпечаным пераездам цераз польскую лінію за 2.000 польскіх марак (з выплатаю у Вільні).

За паўгадзіны фурманка была гатова, і я выехаў у кампаніі трох сьпекулянтаў, так і ня ўвідзіўшы падслуханых мною сяброў.

27. VIII. 1921.

Максім Гарэцкі.

З літэратурнай хрыстаматыі.

Па вёсках Заходняй Беларусі скрозь можна пачуць, як народ кажа на памяць вершы: „Здарэньне", „Хрэсьбіны Мацюка", „Кепска будзе", Быў у чысцы" і іншыя. Аднак, народ ня ведаець, хто гэтыя вершы напісаў. Народ наш ня ведаець імя вялікага песьняра Беларускае Зямлі, імя бацькі нашага адраджэньня ў навейшыя часы— Францішка Багушэвіча. Толькі за астатнія гады, калі кніжка беларуская вальней пашыраецца ў народнай гушчы, пісьменныя сяляне маюць магчымасьць купіць і прачытаць „Дудку Беларускую" Мацея Бурачка або „Смык Беларускі" Сымона Рэўкі з-пад Барысава, дзе сабраны вершы Францішка Багушэвіча пад гэтымі псэўданімамі (вымышленымі іменьнямі).

Францішак Багушэвіч радзіўся ў 1840 годзе і памёр у 1900 годзе. Пахадзіў ён з Ашмяншчыны, са шляхоцкай сям'і. Вучыўся ў Вільні і Пецярбургу, жыў доўгі час на Украіне, а канец жыцьця правёў у Вільні і ў сваім дварку Кушляны ў Ашмяншчыне. Пахован у Жупранах, таксама Ашмянскага павету. Поэт наш быў адвакатам і ўсе свае сілы аддаў на абарону правоў сярмяжнага люду. Але галоўная заслуга песьняра у тым, што ён пад страшным уціскам чужынцоў і сваіх паноў і гандляроў няяў людцам родныя песьні аб іх долі—нядолі, будзіў думку аб адраджэньні і першы паклаў наймацнейшыя падваліны пад наш вызвалепчы нацыянальна-сэцыяльны рух.


Кніжкі Францішка Багушэвіча выйшлі ўжо чацьвёртым і пятым выданьнем і трэба ўзноў іх выдаваць, бо у продажы іх засталося дужа мала. На жаль і „Дудка" і „Смык" друкаваліся дагэтуль толькі лацінскімі літэрамі, і праваслаўны беларускі народ ня ўмеў іх чытаць. Будзем спадзявацца, што беларускія выдаўцы парупяцца надрукаваць іх таксама і нашымі буквамі для праваслаўных, а пакуль што, даўшы для народа гэтую самую кароткую ведамасьць аб слаўным песьняру, зьмяшчаем тут некалькі яго кароценькіх вершыкаў.

Хмаркі.

Хмаркі цёмныя, мае братанькі!
Вецер гоне вас без дарожанькі,
І нідзе-ж для вас няма хатанькі...
Адпачынеце аж у Божанькі!
Гдзе радзіліся, гдзе-ж вы, хмарачкі?
Гдзе „тутэйшімы" называліся?
Ляціцё усё, так як ярачкі....
Хоць-бы трошкі гдзе затрымаліся!
Зямлі родненькай знаць няма у вас,
Ні уголачка, ні прытулачку:
А тут вецер дьзме горшы раз-у-раз,
Ляціцё жа вы без ратуначку!
Лятучы, сълязой зямлю росіце,
Аж шумяць лісткі, зелянее лес!
Уміраючы, жыцьцё носіце,
Усяму жыцьцё, сабе толькі крэс! *)

Калыханка.

Люлі, сынок, люлі-люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад крыламі свае маткі.
А ты чаго ня сьпіші, сынку,
Як-бы чуў ліху гадзінку?
Можа будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госьці,
Ой-то будзе ёй радосьці,
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ей паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякінькім, падсітным,
Піражочкам і з начынкай
Верашчакай, гарачынкай...
Люлі, сынок, люлі-люлі,
Бо ўжо курочкі паснулі.
Ось то будзе рада матка,—
Хоць і простая салдатка,
А усякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі...
Можа будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам:
Людцаў Божых будзеш біці;
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясьці, як ліхога,
Прасіць сьмертухны ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі...
Тады матка прыдзе ў госьці,—
Сын выкіне стары косьці,
Жабруючы пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ёй аб сыне,
Каб ня ведаць, дзе ён згіне
Люлі, сынок, люлі, люлі,



Ф. Багушэвіч.

Бо ўжо курачкі паснулі...
Ой, ня будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь, чым матанька радзіла,
Каб у госьці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад крыламі свае маткі...

*) Капец, пакон.

Бог ня роўна дзеле.

Бог сіроты любіць, але долі не дае (прыказка).

Чым то дзеецца на сьвеце,
Што ня роўна дзеле Бог? —
Адзін ходзіць у саеце,
У залоце з плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай,—велькі труд;
Увесь, як рэшата, сьвяціцца,
Адны латы, адзін бруд!
Адзін мае хатаў многа,
А вялікіх,—касьцёл моў;
Увясьці-б туды хоць Бога,
І той-бы з іх не пайшоў.
У другога ў сьцяне дзюры,
Вецер ходзе, дым і сьнег;
Тут карова, сьвіньні, куры...
Тут пакута, тут і грэх!
Гэты едзе у вагоне, —
Цёпла, мякка, толькі жыць!
А ляціць, як віхар гоне,
А ён сабе толькі сьпіць!
Той ў мяцеліцу, ў марозе,
Што аж вон яму прэ дух,
Паўзе з клункам па дарозе,
У сьнягу увесь па брух!
Гэты хлеба і ня знае,
Толькі мяса ды пірог,
І сабакам выкідае
Усё тое, што ня змог!
А той хлеб жуе з мякінай,
Хлёпча квас ды лебяду,
Разам жывець і есьць з свінкай,
З канём разам п'ець ваду!
Аднаму дзесяткі- служкі
Зарабляюць сотні сот;
Рукі ў яго як падушкі,
Як кісель, дрыжыць жывот!
Другі-ж сам аж на дзесятак
Працуючы, лье свой пот,
А высахшы, як аплатак,
Цянюсенькі, як той кнот.

Песьня № 7.

Гарцуй, танцуй, пане,
Табе хлеба стане.
Скачы, круці жвава
Налева направа!
Прадай, прадай ніўку,
Будзе на выпіўку;
Прадай, прадай злыдні —
Будзе на два тыдні;
Прадай жонку, дзеці —
Выстарча на трэці.
Прадай лес да дрэўка —
Будзе сьвежа дзеўка.
Прадай усё чыста —
Будзе срэбных трыста.
Прадай сваю славу,
Прадай і Варшаву,
Прадай і чэсьць дочкі
За віна паў бочкі.
Бо пан будзе панам
На векі і амэн!
Танцуй, гарцуй, пане,
Покі духу стане.

Аб беларускай мове у школе.

Ня дужа даўна малапісьменнае віленскае выданьне „Жэчыпосполітай" давадзіла, што беларусы, як народ з панскага пагляду дзікі, някультурны, ня маюць права вучыцца на сваёй роднай мове, а павінны карыстацца дзеля гэтага моваю польскаю.

Не хацелася-б ставіць побач з гэтай газэцінай „Літовскія Епархіальныя Ведомості", але прачытаўшы іх № 2, ня грэх у даным прыпадку паставіць. Ня будзем тут зварачываць увагу на іх выразна чужы для беларускага народу дух. Адзначым толькі тое, што яны пішуць аб выкладовай мове у пачатковых школах. Аказуецца, ЛітоўскаеЕпархіальнае Сабраньне 9 (22) — 14 (27) чэрвеня 1921 г., як відаць з пратаколу, зьмешчанага у яго органе, пастанавіла: „Прасіць урад аб дазволе праваслаўнаму духавенству адчыняць без перашкод каціхізатарскія хрысьціянскія школы дзеля абучэньня Закону Божаму, малітвам, чытаньню і пяяньню ў храме, пачаткам пісьменнасьці і лічэньня, на мове, якой пажада-

43

ець мясцовае насяленьне, каторае, як заяўлаюць прадстаўнікі з мейсцаў, забясьпечыць гэтыя школы коштам."

Аб мове, як відзім, сказана дужа далікатна і з боку людзкасьці, так сказаць, зусім беззаганна.

Але пастараемся раскрыць карты проста і бяз хітрых далікатнасьцяў.

Ясна, якой мовы могуць пажадаць нашы тутэйшыя праваслаўныя зрусіфікаваныя сяляне Не францускай-жа і ня кітайскай, а беларускай ці расейскай. Як спаланізаванае каталіцкае беларускае насяленьне—беларускай або польскай. Тым болей у школах царкоўных.

Дык відаць, што праваслаўнаму беларускаму духавенству ў яго агуле (мы не гаворым тут аб сьвядомых сьвяшчэньніках-бела усах), што яму на чале з архірэям-маскалём зусім не баліць сэрца за родны свой народ. За царом яно стаяла за расейскую мову навет у касьцёлах беларускіх, а цяпер лёгка прыміраецца з тым, каб тры міліёны беларусаў-каталікоў навекі зрабіліся палякамі, абы-б ісьціна-рускі дух ня выветрыўся сярод праваслаўных беларусаў, угатаваных зрабіцца на векі-вечныя аднэй нацыянальнасьці з нашым архірэем Елеўферыем-маскоўцам.

Калісь гэты архірэй адказаў беларускай дэлегацыі, прасіўшай выдаць загад сьвяшчэньнікам, што казаць казаньні для беларусаў трэба пабеларуску, адказаў, уздыхаючы аб „єдінай, неделімай", што „царква павінна быць апалітычна» (не павінна ўмешывацца ў палітыку). Гэтыя залатыя словы ў вуснах служыцеля Хрыстовага добра ўрэзаліся ў памяць сьвядомым беларусам.

Гэтую-ж „апалітычнасьць" мы відзім і ў далікатных, інтэрнацыянальных (як і трэба для запраўднае царквы) пастановах зьезду.

Відзім яе і ў тым, што „апалітычныя» прадстаўнікі на зьездзе гарантуюць абасьпечаньне школак у сваім смаку коштамі, тады як гэтыя-ж асобы у справе адчыненьня беларускіх школ даводзяць сваю „апалітычнасьць" да сабатажу (змаганьня) тайнага і яўнага.

А што пры іхнай, аццоў духоўных, старанасьці зрусіфікаваныя сяляне папросяць не беларускай, а расейскай мовы ў школе,—можна сьмела цьвердзіць, а ў разе патрэбы давесьці многімі фактамі з дакумэнтамі ў руках.

Вось на чым будуюцца далікатныя пастановы зьезду!

Што гэта іменна чулася на зьездзе „прадстаўнікоў з месц", відаць, як гэта ні прыкра нам тут выпісываць, відаць з таго, што адзін з прадстаўнікоў, такі навет, як глыбоцкі сьвяшчэньнік Ігнатовіч, прасіў у Начальніка Польскае Дзяржавы Пілсудзкага, калі той быў пядаўна у Глыбокім, прасіў дазволу ня расейскія пачатковыя школы.

Мы хочам думаць, што сьвяшчэньнік Ігнатовіч, вядомы нам і асабіста, зрабіў гэткую вялікую памылку за сваё вялікае усердзьзе ў справах веры, якія справы прызвычаіўся вязаць з расейскаю культураю і з расейскаю асобаю свайго архірэя. І думаем таксама, што не абышлося тут і без моральных ўражаньняў, вынесеных ім са зьезду. Тымчасам, такія згубныя памылкі астаюцца фактам, хоць не сумняваемся, што абдумаўшысь сьвяшчэньнік Ігнатовіч пастараецца іх паправуляць...

Дык трэба на астатак раскрыць карты і сказаць рашуча: годзе пытацца ў насяленьня, якой яно захочаць мовы ў школе. Ня радзіць-жа эндэцкая „Жэчпосполіта" пытацца, ці хочаць польскі народ у Польшчы польскае мовы ў школе. Было-б дзіўным і глупым пытацца у расейца, ці хоча ён расейскай мовы ў сваёй школе? Было-б вялікаю лухтою пытацца тое-ж самае у немца, француза, ці латыша, або эстонца.

Чаму-ж гэта з дурнымі пытаньнямі можна падходзіць толькі да цёмнага беларуса?

Ня пытаюцца-ж духоўныя айцы у цёмных мужыкоў аб справах веры. Дык годзе ужо будзець гэтакіх пытаньняў і аб мове ў школе.

Падагогічная навука даўно сказала свой прысуд, што навучаньне дзетак павінна адбывацца ў роднай мове ў мове маткі.

Ці-ж дзеля нашага праваслаўнага сялянства, пры ўсёй яго зрусіфікаванасьці, роднай мовай зьяўляецца расейская?

Ці-ж дзеля нашага каталіцкага сялянства, пры ўсёй яго спаланізаванасьці, роднай мовай ёсьць польская?

Ніводзін сумленны чалавек гэтага ня скажаць.

А тымчасам, навет сумленыя асобы хочуць пытацца у праваслаўных беларусаў, ці ня хочуць яны у школе расейскай мове?

Як ізноў-жа другія часам адважуюцца радзіць падыйці з пытаньнем да беларусаў-каталікоў: ці ня хочуць яны ў школе польскай мовы?

Запраўдная-ж далікатнасьць і запраўдная людзкасьць, у згодзе з прысудам апалітычнае навукі, даець адзін загад: ня пытаючысь у цёмнага ці несьвядомага народа, выкладаць яму навуку у яго роднай мове.

Хто так ці гэтак супроць гэтага, той—„палітык" з злою воляю або сам цёмны чалавек.

Дзед Кузьма.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Баруны, Ашмянскага пав.

Пасьля арышту нашага пробашча кс. Пятроўскага шмат цікавага ў нас гаворацъ. Першы, што быццам адзін з ўраднікаў Староства скакаў нашым дэлэгатам, што пробашч верніцца, але сялянам трэба яму падзякаваць і папрасіць, каб ён ад нас выехаў. Гавораць у нас, што ў арышце пробашча вінен крамнік каапэратыву, але мне здаецца, што гэта байкі. Гэты добры грамадзянін, суменны працаўнік і на такую рэч, як даносы, ён-бы не пайшоў. Каапэратыў наш працуець добра: можна купіць бадай усяго, патрэбнага ў гаспадарцы, але часам і там не хапае тавару для ўсіх. Гэта і зразумела—што ня можна купіць за 100 мк., каторыя кожны заплаціў ў каапэратыў. Ня ведаю, як ў нас будзе цяпер з школамі. Беларускую семінарыю зачынілі, а ці адчыняць польскія школы—ня ведаем. Мусіць на гэты год дзеці будуць без навукі.

Праходжы.

Багданаў, Валожын. пав.

Каля 2-х тыдняў таму ў нашай вёсцы сарганізаваўся Гурток Моладзі. У ўрад гуртка вайшлі энергічныя і працавітыя людзі, каторыя і дагэтуль бралі удзел ў грамадзкай працы. Малады Гурток ўжо мае маленькую бібліатэку, значную частку каторай даў ў часовы ўжытак ўрад каапэратыву. Гурток маець прыняцца за адбудову зруйнованага дому, каторы мяйсцовы пан ахвяраваў на дом людовы. Жычым гуртку памыснага развіцьця і спадзяваемся, што ён патрафіць споўніць свае заданьні.

А. Д.

Збыт праз каапэратывы.

Агульная дарагоўля змушае сялянства больш гарнуцца да сваіх спажывецкіх таварыстваў, каторыя, як мага, стараюцца задаволіць яго патрэбы. Усе ведаюць, што і вясковыя каапэратывы маюць на мэце задаволеньне патрэб вясковага гаспадара. Але кожны сябра каапэратыву не павінен глядзець на ўвесь каапэратыўны рух з сваей толькі званьніцы. Ен павінен ведаць, што як аддзельныя людзі аб'яднаюцца ў каапэратыве дзеля супольнай барацьбы з прыватным гандлем, так аддзельныя каапэратывы аб'яднаюцца ў „каапэратывы каапэратываў" — Саюзы. У саюз ўходзяць каапэратывы вясковыя і мястовыя. Зусім зразумела, што патрэбы гэтых каапэратываў розныя, бо складаюцца яны з людзей зусім розных заняцьцяў. Мястовыя каапэратывы патрабуюць як раз таго, чаго за шмат ёсьць ў вёскі. Калі вясковы каапэратыў дасьць мястоваму ізбыткі сваей вёскі і гэтым дасьць мястоваму жыхару магчымасьць пражыць танней, дык тады і выраблены местам тавары будуць каштаваць танней. Апрача гэтага, каапэрацыя павінна памятаваць, што толькі тады ўвесь рух будзе пашырацца і разьвівацца, калі адзін будзе падтрымліваць другога. Таксама, збываючы свае прадукты праз каапэратыў, селянін атрымае справядлівую цану,—і той зыск, каторы йшоў да кішэні гандляра-пасрэдніка, застанецца ў яго. Пры арганізацыі закупаў каапэратывы запісываюць, хто і сколькі даставіў прадуктаў і калі прадасьць іх даражэй, дык неспадзяваны зыск аддасьць пастаўшчыку. Гэтак мы бачым, што за свае прадукты праз каапэратыў селянін атрымае патройны зыск: 1) атрымае справядлівую цану 2) атрымае тавары места па таньшых цэнах; 3) ўзмоцніць свой каапэратыў, бо той зробіць больш абароту.

Сяляне! Аддавайце свае прадукты ў каапэратывы!

Каапэратар-селянін

Ст. Пруды.

Нядаўна ў нас быў наш духоўны ацец-архіепіскап Літоўскі і Віленскі Елеўферый, каторы разам з многім духавенствам зрэвізаваў парахвіі Вялейскага і часткі Ашмянскага паветаў. Уладыка рэвізаваў, а „іжэ с нім" п'янствавалі так, што навет усім чужым людзём было брыдка. Ня ведаю, ці са згоды і дазвозу Уладыкі робіцца ўсё гэта. Калі так, дык дзіўна, што Уладыка гэта дазваляе, а калі не, дык яшчэ дзіўней, што духавенства так сябе праводзіць, а Уладыка не зьвяртае на гэта ўвагі. Нічога няма дзіўнага, што каталікі сьмяюцца з нас, што нашы айцы духоўныя даюць добры прыклад сваім парахвіянам. Калі езьдзіў біскуп, дык ксяндзы так не рабілі. Адным словам, мусім сказаць, што наша праваслаўнае духавенства стаіць далёка ніжэй за каталіцкага, як з моральнага боку, так і з боку агульнага разьвіцьця. Нашы айцы займаюцца найбольш русіфікацыяй ды п'янствам. Спадзяваемся, што такія выпадкі, як падчас рэвізіі Уладыкі, больш паўтарацца ня будуць, бо яны толькі паказываюць праваслаўе з дрэннага боку.

Адчыненая ў Вільні духоўная семінарыя можа дасьць нам лепшых сьвяшчэньнікаў.

Л.

Як паны прадаюць свае „маёнткі" у Вішнеўскай і Забрэзкай воласьці.

Чуюць паны, што скора з маёнткамі ім прыдзецца растацца, дык вось яны найхутчэй стараются прадаць свае вялікія обшары зямлі. Імяньне Вішнева графа Хрэптовіча—Буценева, якое складаецца з 10 фальваркаў, абшарам каля 32,000 дзес., ужо падзелэна на хутары (парцэлі). Дзеля таго, што п. Хрэптовіч—Буценеў жыў няйболей за граніцей альбо у Варшаве, маёнткамі яго кіраваў і распараджаўся, як сам хацеў, нейкі п. Карчэўскі.

Вось гэты п. Карчэўскі і прадае цяпер графскія маёнткі. Прадаець ён сялянам, але вядома ня ўсім, толькі тым, хто мае хрошы. Як ні цяжка купляць селяніну у пана зямельку, але ўсежтакі збываюць астатнія кароўкі і нясуць пану грошы. Спачатку п. Карчэўскі прадаваў па 25—35 тысяч марок за дзесяціну, але як убачыў, что ёсьць цяпер шмат ахвотнікаў, дык падбавіў ажно да 80 тысяч за дзесяцшіну. Прададзены ужо з гэтага маёнтку Вішнева 3 фальваркі: Славенск, Каралінова і Галянова. Фальварак Славенск, у якім было каля 400 дзесяцін, падзелен на 23 хутары. Зямлю купілі сяляне вось гэткіх вёсак: Роўкавічы, Харытоны, Жомайдзь, Цвіраўшчыны, Піліпяняты, Куцяняты, Ялянішкі і Калтыкі. Прададзены гэтакім парадкам фальваркі Каралінова і Галянова абшарам разам каля 800 дзесян. Куціць-то купілі сяляне зямельку, хто 2—3 дзесян. а хто й дзесяць, але шмат хто некалькі гадоў будзе без малака есьці, бо пазбывалі астаткія кароўкі. Ды й тымі маркамі, якія атрымалі за свае кароўкі, заплацілі толькі за палавіну кошту купленай зямлі, а чым яны будуць плаціць другую палавіну ў лютым месяцы 1922 году? Прыдзецца мусіць прадаваць свае хаткі, каб заплаціць пану за зямлю. Але вось яшчэ кажуць мужычкі: „За зямлю-то ўжо мы далі грошы, але ня маем жаднай паперкі на руках аб дазволе на куплю зямлі". Дык кажуць, што яе ад нас адбяруць. Тады ня будзе ні зямлі ні кароўкі.

Падарожны.

Вываз дрэва з Віленшчыны.

(Польскае інформацыйнае бюро Э. Э.) Вываз дрэва з Віленшчыны ўзрос у жніўню (аўгусьце) надта значна ў параўнаньню з прошлымі месяцамі.

Падчас калі ад 1 студня (январа) да 1 жніўня гэтага году, г. зн. у працягу сямёх месяцаў, рывезена 4658 вагонаў дрэва, ў адным толькі жніўню вывезена — 1311 вагонаў, або блізка трэцяя часьць датыхчасовай колькасьці.

Беларускія вучыцельскія курсы ў Дзьвінску.

ДЗЬВІНСК. І. IX. 21. (уласн. кар.).

Сёнека скончыліся тутака беларускія вучыцельскія курсы, якія мелі на мэце падгатовіць настаўнікаў для беларускіх школак, адчыненых у Латгаліі.

Праслухала курсы 73 чалавекі беларусаў-вучыцялёў і вучыцелек.

Атрымалі пасьведчаньні на права выкладаньня ў беларускай школе 42 чалавекі.

Курсы закончыліся актам, на якім выступілі з прамовамі інспэктар народных школак Дзьвінскага павету, Старшыня Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына" Канстантын Езавітаў і лектары.

У прамовах была адзначана вялікая радасьць беларусаў, што ў межах дэмакратычнай Латвіі беларуская нацыянальная меншасьць прыступіла да грунтоўнай культурна-прасветнай працы і адбудовы сваей школы.

ХРОНІКА

— Рэвалюцыйная вайсковая рада Беларускай Савецкай Рэспублікі абвесьціла ваенны стан на ўсёй Савецкай Беларусі

— Чэхаславацкі Урад выказуець шчырыя адносіны да беларускае вучнёўскае моладзі і нядаўна назначыў стыпендыі 20 студэнтам-беларусам Пражскага Унівэрсытэту. (Белпрэсбюро).

— У польскай газэце „Nowiny Wileńskie" друкуюцца пераклады з беларускага: „Кароткі агляд гісторыі беларускае літэратуры" Максіма Гарэцкага і „Страхі жыцьця"—драма Францішка Аляхновіча. На вялікі жаль, газэта гэтая не дастала дазволу выхадзіць што дзень і вярнулася ад штодзеннай да тыднёвай.

— З пастаноў Літоўскае Епархіальнае Рады: аб захваце Яршэвіцкай, Радашк. благач., царквы. „Слухалі рапарт сьвяшч. Яршэвіцкай царквы а. К. Лукашэвіча ад 17 красавіка 1921 г. аб захваце каталікамі з дапамогай прахадзіўшага войска праваслаўнае Яршэвіцкае Сьв.-Узьнясенскае прыпіснае царквы, у 1919 г. ў ліпню месяцы. Захват адбыўся пры лаянцы, зьнявагах і пагрозах з боку вайсковых. Царкоўную утвар і абразы дазволена было ўзяць, але меснапачытаны абраз Багародзіцы аддадзены ня быў. К рапарту далучана пісьменнае вымаганьне аб аддачы царквы з боку вайсковае ўлады і з боку тутэйшага ксяндза і выпіска з кліравай ведамасьці 1840 года, якая сьведчыць, што царква была толькі уніяцкай, а касьцёлам ніколі ня была.

Пастанавілі: паведаміць аб гэтым ўладу і прасіць аб узвароце царквы і абраза".

(„Літ. Епарх. Ведом.")

— Чародныя нумары віленскіх паланафільскіх газэт на беларускай мове: „Jednaść" (Еднасьць) і „Родная страха" ня выйшлі Ці сканалі ці толькі часова захварэлі—невядома.

— Неўзабаве мае выйці месячнік беларускіх ксяндзоў-адраджэнцаў пад назовам „Ruń" (Рунь).

— Вядомы беларускі дзеяч і прапаведнік евангелізму Дзекуць-Малей зьбіраецца выдаваць часопісь беларусаў-евангелікаў і рыхтуець у друк Евангельле на беларускай мове свайго перакладу. Як вядома, ксяндзы беларусы ужо выдрукавалі першую часьціну Евангельля на беларускай мове для нашых каталікоў (лацінкаю), і толькі наша „палітычнае" праваслаўнае духавенства сьпіць мёртвым сном, жывучы салодкай для яго расейшчынай.

— Лекцыя на беларускай мове пісьменьніка Макара Косьцевіча аб „Сіле прафесіянальнага руху ў Няметчыне", якая мелася быць 11 верасьня ў Доме Віленскіх прафесіянальных Саюзаў, адкладзена на сягоньня і адбудзецца $6\frac{1}{2}$ гадз. ўвечары. Тэзісы лекцыі такія:

1. Вынятковыя законы проці социялістаў.
2. Шпаркасьць росквіту.
3. Унутраная будова вялікага саюзу.
4. Дзейнасьць профэсыянальных арганізацыяў.
5. Міжсаюзныя цэнтры.
6. Профэсыянальная барацьба.
7. Узаемная падмога.
8. Агулы прафэсыянальнай барацьбы.
9. Слабыя месцы ў нямецкім профэсыянальным руху.

— Усе забыліся на Антона Грыневіча, які ўжо блізка году сядзіць у вастрозе і ніяк не дачакаецца суду. Тымчасам даўгая няволя можа зусім зьесьці і без таго слабое здароўе нашага кампазытара і зьбіраньніка народных песьняў. Няўжо-ж так і няма яму ніякага ратунку за той няшчасны пераход маскоўска-бальшавіцкага фронту?

— У беларускага дзеяча К. Душэўскага, які цяпер за граніцаю, памёрла ў Вільні адзіная дачушка.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзець больш падпісчыкау, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей". Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытау пісьменны сусед, або настаунік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце усе разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагау і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прыміце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаунікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці" у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

— Б. Інспэктар Віленскай Беларускай Гімназіі, вядомы ў краі фізык А. Дмахоўскі назначан дырэктарам Цэнтральнага Фізычнага кабінэту ў Вільні.

— У пятніцу 12-га верасьня адбыліся чародныя паседжаньні Таварыства Беларускае Школы і Белар. Нац. Камітэту ў Вільні. Прынята чарада важных пастаноў.

— 15-га верасьня пачынаюцца заняткі ўва ўсіх клясах 1-й Віл. Белар. Гімназіі. Сёлета будзець разам з паралельнымі 14 клясаў (тры прыгатавальных, 8 аспаўных і тры першых паралельных). Запрошаны новыя педагагічныя сілы. Выкладаньне ужо ува ўсіх клясах будзе на беларускай мове. Пры гімназіі адчыніўся інтэрнат для прыезных вучняў.

— Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі — прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

— Чужыя людзі ў нашым краі, з якіх мабыць, складаецца усё Інформацыйнае Польскае Бюро „Э. Э." слаба разьбіраюцца ў нашым краі, а пры лішней шовіністычнай стараннасьці часта вярзуць шалёную лухту. Так бюро гэтае (чытаем у № 204 вілен. выд. „Жэчыпосполіт.") са слоў нейкай „добра ведаючай, нядаўна прыбыўшай з Коўні асобы" паведамляе: „Рулём Беларускага Ураду, жывучага ў Коўні ў гатэлю Метраполь на Алеі Вольнасьці, кіруець быўшы урадовец Зямельнага Аддзелу ў Віленшчыне п. Ластоўскі".

Што урадовец такі ёсьць і цяпер у Вільні, гэта праўда, але пры чым тут Старшыня Рады Міністраў Бел. Нар. Рэспуб. і вядомы дзеяч і пісьменьнік беларускі Вацлаў Ластоўскі? Далей Бюро называе міністра жыдоўскіх спраў у Беларускім Урадзе, таксама шырока вядомага на Беларусі і за граніцай дзеяча Жытлоўскага — „неякім" і робіць яму, сіаністу, закіды у... бальшавізьме!

Але рэкорд пабіваюць гэткія радкі бюровага паведамленьня: „Трэцяй найвыдатнейшай асобай у тым Урадзе зьяўляецца дзеяч беларускі яшчэ з перадваеннага часу Луцкевіч".

Антон Луцкевіч (Антон Навіна), запраўды адзін з найстарэйшых беларускіх дзеячаў, правадыр беларускага духу, быў Старшынёю рады Міністраў Бел. Нар. Рэсп. да Ластоўскага, з урадам Ластоўскага нічога супольнага ня маець, жывець у Вільні, кожнаму пісьменнаму віленцу вядома яго імя, не гаворачы аб шырокай вядомасьці сярод палітычных кругоў заграніцы,—і толькі цёмныя асьведамляньнікі з „Э. Э." нічога ня ведаюць!

— Начою з 12 на 13 верасьня забіт патрульным салдатам вучань 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі, 7-е клясы, Арнольд Дыліс. Ен варочаўся дамоў з тэатра і пералязаў цераз плот, недачакаўшыся, калі адчыняць фортку. Сьмерць А. Дыліса, аднаго з лепшых і здольнейшых вучняў, зрабіла страшэнна цяжкое ўражаньне на ўсю Гімназію.

Літоускае жыцьце.

— 12-га верасьня чародны нумар літоўскай газэты „Глос Літвы", заўсёды, між іншым, прыхільнай да беларусаў, ня вышаў. Аб тым, што гэтая газэта мае быць зачынена, стала вядома яшчэ некалькі дзён таму назад.

Курс на грошы ў Вільні.

12 верасьня 1921 г.

Нямецкія маркі (1000)	40
Ост-маркі (1000)	39
Доляры	3.940
Золата рублі	186.000

Krynica

Biełaruskaja sialanskaja hazeta
Adres: Wilnia, Zawalnaja 7. — Kaštuje: na hod 500 mk., na paŭhoda 250 mk., na 3 mies. 125m.

Рэдактар-Выдавец М. Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК", Субач, 2.